*Новыя выданні*

Дзмітрый ДЗЯТКО,
кандыдат філалагічных навук,
загадчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

# МАЎЛЕНЧАЯ КУЛЬТУРА НАВУЧЭНЦА ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ – НАДЗЁННЫ КЛОПАТ

**Свірыдзенка, В. І.** Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў: тэорыя і практыка: манаграфія / В. І. Свірыдзенка. – Мінск: БДПУ, 2019. – 277 с.

Манаграфія кандыдата педагагічных навук, дацэнта Вольгі Свірыдзенкі прысвечана пытанням фарміравання маўленчай культуры асобы ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму. Гэта сістэмнае даследаванне працэсу станаўлення моўнага, камунікатыўнага, этычнага і эстэтычнага кампанентаў культуры беларускага маўлення навучэнцаў першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Актуальнасць асветленай у навуковай працы праблемы абгрунтавана, па-першае, сацыялінгвістычнай сітуацыяй у Рэспубліцы Беларусь, па-другое, істотным уплывам ступені развіцця маўленчай культуры білінгвальнай асобы на фарміраванне яе агульнай культуры.

Манаграфія складаецца з чатырох раздзелаў. У першым аўтарам распрацаваны тэарэтыка-метадалагічныя асновы станаўлення культуры беларускага маўлення навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах білінгвальнай адукацыі. Зыходзячы з гэтага, вылучаны і ахарактарызаваны мэтавы, зместавы, працэсуальны і дыягнастычны кампаненты метадычнай сістэмы фарміравання маўленчай культуры навучэнца-білінгва пры авалоданні беларускай мовай. Таксама разглядаюцца такія пытанні, як аналіз сацыялінгвістычнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, вылучэнне асаблівасцей агульнага і дзіцячага білінгвізму. Створана мадэль моўнай асобы навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя.

Другі раздзел “Метадычныя асновы фарміравання маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў пры засваенні беларускай мовы” прысвечаны фарміраванню кампетэнцыі – моўнай, маўленча-камунікатыўнай, сацыякультурнай і лігвакультуралагічнай.

Трэці раздзел прысвечаны праблеме рэалізацыі распрацаванай аўтарам сістэмы фарміравання маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў у вучэбна-метадычным забеспячэнні працэсу навучання беларускай мове.

У навуковай працы прапанаваны розныя спосабы далучэння дзяцей малодшага школьнага ўзросту да беларускай мовы пры дапамозе спецыяльна адабранага і метадычна арганізаванага моўнага і маўленчага матэрыялаў; раскрыты шляхі фарміравання ў іх прадметных кампетэнцый; акрэслены змест усіх кампанентаў культуры маўлення, засваенне якога адбываецца падчас фарміравання моўнай, маўленча-камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый. У манаграфіі праілюстравана рашэнне задач фарміравання маўленчай культуры білінгвальнай асобы на прыкладзе аўтарскіх вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове для 2–4-х класаў і вучэбна-метадычнага забеспячэння факультатыўных заняткаў “У Краіне знаёмых незнаёмцаў” (3–4-я класы).

Да безумоўных вартасцей выдання трэба аднесці яго грунтоўнасць і практычную скіраванасць. Зробленыя аўтарам тэарэтычныя высновы і метадычныя рэкамендацыі пацвярджаюцца данымі эксперыментальна-вопытнага навучання.

Манаграфія вылучаецца грунтоўнасцю тэарэтычных палажэнняў, канцэптуальнай дакладнасцю, практычнай значнасцю. Падрыхтаваная аўтарам праца адзначана навізной падыходу да вырашэння актуальных праблем сучаснай пачатковай філалагічнай адукацыі.

Кніга будзе цікавай і карыснай шырокаму колу спецыялістаў у галіне моўнай адукацыі дзяцей малодшага школьнага ўзросту.